го-либо, все-таки находят свое отражение в кинофильмах, что свидетельствует об их априорной значимости в жизни человека.

1. *Агафонова, Н. А.* Общая теория кино и основы анализа фильма / Н. А. Агафонова. – Минск : Тесей, 2008. – 392 с.

2. В августе 44-го (кинофильм) [Электронный ресурс] // Видеохостинговый сайт «YouTube». – 2019. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=QhB2dJX5QFE. Дата доступа: 13.03.2019.

3. В тумане (кинофильм) [Электронный ресурс] // Видеохостинговый сайт «YouTube». – 2019. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=bh-gC1jzAS4. Дата доступа: 11.03.2019.

4. Динамика ценностных ориентаций молодежи в трансформирующемся обществе / Е. М. Бабосов [и др.] ; под общ. ред. Е. М. Бабосова. – Минск : Современное слово, 2001. – 159 с.

5. *Крукоўскі, М. І.* Бляск і трагедыя ідэалу : філасофскія эцюды пра ідэалы, дэмакратыю і суверэнітэт / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 352 с.

6. *Рокич, М.* Природа человеческих ценностей / М. Рокич // Свободная пресса. – 1973. – № 5. – С. 20–28.

7. *Сильванович, О. Л.* Национальная киностудия «Беларусьфильм»: художественные и производственные стратегии : автореф. дис. ... канд. искусствоведения : 17.00.03 / О. Л. Сильванович ; Центр исслед. бел. культуры, языка и литер. НАН Беларуси. – Минск, 2017. – 23 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МАГЧЫМАСЦІ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ФАРМІРАВАННІ КУЛЬТУРЫ ТАЛЕРАНТНАСЦІ

***П. В. Стасяк,*** *аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Адной з асноватворных уласцівасцей грамадства з’яўляецца разнастайнасць формаў якія яго напаўняюць. Расавыя і палавыя, нацыянальныя і ўзроставыя, канфесійныя, прафесійныя і мноства іншых адрозненняў аказваюць прамы ўплыў на характар узаемаадносін паміж асобнымі індывідамі і сацыяльнымі групамі, якія могуць прывесці да з’яўлення неразумення, пераходзячага ў адкрытае супраць-

стаянне. У дадзенай сувязі актуальным пытаннем становіцца пытанне вывучэння механізмаў функцыянавання, якія змякчаюць, або наогул нейтралізуюць ўзнікаючыя супярэчнасці. У выніку, дзякуючы гэтаму адбываецца ўзрастанне цікавасці да такой з'явы, як «культура талерантнасці» – найважнейшага сродка пераадолення сацыяльнага напружання.

Талерантнасць з’яўляецца досыць позняй з’явай у культуры і псіхіцы асобы чалавека, бо на сённяшні дзень аб’ектыўная рэчаіснасць спрыяе большаму развіццю процілеглай з’явы – інталерантнасці. Моманту ўсведамлення асобай важнасці і актуальнасці талерантнасці папярэднічае працяглая псіхалагічная, маральная і духоўная праца над сабой. У сучасным грамадстве прынята такія тыпы працы ў большай ступені ўскладаць на адукацыйны працэс, што пацвярджаецца падпісанай 16 лістапада 1995 г. краінамі – членамі ЮНЕСКА Дэкларацыяй прынцыпаў талерантнасці. На аснове гэтага дакумента, як сцвярджае В. А. Цішкоў, ужо сёння востра паўстала пытанне стварэння новага кірунку ў педагагічнай навуцы, а менавіта – «педагогікі талерантнасці». Па словах аўтара, зона асноўнай увагі дадзенага кірунку педагогікі павінна быць сфакусіравана на глыбокім даследаванні сутнасці талерантнасці з яе наступным укараненнем у міжасобасныя зносіны і, міжгрупавое ўзаемадзеянне на аснове падрабязнага аналізу сацыяльнай каштоўнасці, які базіруецца на маральна-этычных нормах.

Як пералік асноўных правоў і свабод, прынцыпы талерантнасці выкладзены і замацаваны ў шэрагу нарматыўна-прававых дакументаў міжнароднага ўзору: Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі, Еўрапейская канвенцыя аб абароне праў чалавека і асноўных свабод і інш.

На сённяшні дзень нават пры ўмове, што найбольш важнымі грамадскімі інстытутамі з'яўляюцца навучальныя ўстановы, можна назіраць узрост цікавасці як з боку мо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ладзі, так і з боку ўлад да стымулявання павелічэння колькасці і наступнае развіццё афіцыйна-зарэгістраваных грамадскіх арганізацый. Гэты працэс сведчыць пра імкненне да сцірання міжканфесійнай дыферэнцыяцыі, паніжэнне ўзроўня эгаізму, якое перашкаджае з'яўленню палітычнага экстрэмізму, што сёння назіраецца ў шматлікіх заходніх краінах. Такім чынам, усё часцей і больш выяўляецца запатрабаванне ў фарміраванні культуры талерантнасці як аднаго з вядучых суб'ектаў педагагічнага і, нават у большай ступені, сацыяльна-культурнага працэсу.

Аналіз сучасных работ паказвае, што даследаванні сацыяльных і сацыякультурных аспектаў талерантнасці, у тым ліку і яе фарміраванне, значна адстаюць ад даследаванняў этычнага, філасофскага і псіхалагічнага бакоў яе праявы. Аналіз месца і ролі талерантнасці ў грамадскім жыцці можна выявіць у працах невялікага ліку аўтараў (А. А. Лявонцьева, Б. С. Гершунскага, В. А. Лектарскага і інш.).

Варта адзначыць, што праблема фармавання культуры талерантнасці непасрэдна звязана з праблемай міжнацыянальных зносін (А. Н. Някрасава, Л. Р. Заурбекава, Н. Р. Малікава), выхавання міжнацыянальнай памяркоўнасці (З. Ф. Мубінава, Л. М. Сімашына, Р. Т. Гарданоў), выхавання культуры міжнацыянальных зносін (В. П. Камароў, М. Куранов). У пералічаных працах выразна прасочваецца ўхіл у бок разгляду этнічнай талерантнасці ў кантэксце задач выхавання нацыянальнай самасвядомасці. Аднак не трэба забываць, што ўсе пералічаныя аспекты разгляду як самой талерантнасці, так і сумежных пытанняў, у сваёй большай ступені выяўляюцца ў сацыяльна-культурнай дзейнасці чалавека. У дадзеным асяроддзі праўдзівы бок асобы выходзіць вонкі і чалавек, адхіляючыся ад сваёй паўсядзённасці, паглыбляецца ў задавальненне недахопаў самавыяўлення.

З'яўляючыся комплекснай якасцю асобы, талерантнасць фарміруецца адначасова ў некалькіх жыццёвых сферах дзейнасці чалавека: навучальна-выхаваўчай, сямейна-побы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тавай і вольнага часу. Трэба адзначыць, што кожная з пералічаных сфер мае сваю ўнікальную спецыфіку патэнцыялу ўздзеяння.

Грамадскія арганізацыі адыгрываюць важную ролю ў сацыяльна-палітычным жыцці грамадства нароўні з палітычнымі партыямі і адносяцца да некамерцыйнага сектара дзейнасці. Адрозненнем ад палітычнай партыі з'яўляецца тое, што яны не прэтэндуюць на ўдзел у ажыццяўленні ўлады. Спецыфіка грамадскіх арганізацый складаецца ў тым, што яны ўяўляюць сабой няўрадавыя, недзяржаўныя добраахвотныя аб'яднанні грамадзян на аснове сумесных інтарэсаў і мэт. Часам выкарыстоўваецца вызначэнне «трэці сектар» (грамадскі) у дадатак да публічнага ці прыватнага сектара [3]. Пры гэтым грамадскія арганізацыі дзякуючы сваёй спецыфічнай дзейнасці вырашаюць задачы шырокага грамадскага значэння, прымаюць значны ўдзел у дзяржаўным і сацыяльна-культурным будаўніцтве грамадства.

Маладзёжныя грамадскія арганізацыі ствараюцца на добраахвотнай аснове і з'яўляюцца адной з найболей эфектыўных пляцовак фарміравання культуры талерантнасці, паколькі засноўваюцца на пэўных маральных якасцях. Дзейнасць такіх арганізацый грунтуецца на групавых зносінах і пераследвае агульныя мэты, накіраваныя на рэалізацыю тых навыкаў, якія ў поўнай меры немагчыма асвоіць і рэалізаваць у іншых сацыяльных інстытутах. Дадзенае сцвярджэнне абапіраецца на разуменне тэрміна «грамадская арганізацыя» як віда дзейнасці вызначанай скіраванасці [2].

Даследнік Е. І. Грыгор’ева падзяляе маладзёжныя грамадскія аб’яднанні на тры групы паводле іх мэт:

1. Арганізацыі, якія прапаноўваюць сваім членам розныя віды актыўнасці, якія забяспечваюць уключэнне моладзі ў сацыяльную практыку;

2. Арганізацыі, асноўнай мэтай якіх можна лічыць задавальненне патрабаванняў і інтарэсаў, а таксама перадача ведаў, навыкаў і ўменняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Аб’яднанні і арганізацыі, якія прапануюць сваім удзельнікам пэўную сістэму каштоўнасцей, якая з’яўляецца падмуркам пабудовы яе дзейнасці.

Дарэчы будзе адзначыць, што найважнейшай праблема функцыянавання любой грамадскай арганізацыі, асабліва маладзёжнай, складаецца ў стварэнні індывідуальнай матывацыі кожнага з удзельнікаў, заснаванай на магчымасці выбару, які дазваляе самарэалізавацца.

Спецыфіка функцыянавання грамадскіх арганізацый, якая абапіраецца на працэс фарміравання культуры талерантнасці асобы маладога чалавека, увесь час развіваецца ў прасторава-часавым культурным асяроддзі. У яго рамках ствараюцца пэўныя магчымасці, рэалізацыя якіх спрыяе здыманню псіхалагічнага напружання; раскрываюцца адукацыйныя, псіхолага-педагагічныя і інтэлектуальныя здольнасці асобы; вызваляецца асобасны патэнцыял па сродках разняволення і выхада за межы зоны камфорту.

Грамадскія арганізацыі спалучаюць у сабе розныя віды чалавечай дзейнасці, накіраваныя на выкананне шэрагу функцый: інфармацыйна-асветніцкую, камунікатыўную, рэкрыяцыйна-аздараўленчую, культуралагічную і іншыя, што сведчыць пра іх статус часткі сацыякультурнай сферы, важнасць у фарміраванні культуры талерантнасці асобы.


1. *Григорьева, Е. И.* Потенциал досуговых общественных объединений в формировании толерантной культуры молодежи / Е. И. Григорьева, А. А. Перегудов ; М-во обр. и науки РФ, ФГБОУ ВПО «Тамб. Гос. ун-т им. Г. Р. Державина». – Тамбов : Издательский дом ТГУ им. Г. Р. Державина, 2012. – 45 с.

2. Энциклопедический социологический словарь. – М. : Сов. энцикл., 1995. – 939 с.

3. Федеральный закон «Об общественных объединениях» от 19.05.1995 № 82-ФЗ (последняя редакция). Содержание: pravo.gov.ru. – Дата доступа: 09.02.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ